# *СУСТРЭЧА 11*

# *ІСЦІ ЗА ХРЫСТОМ У EQUIPES NOTRE-DAME*

«…Хрысціянскія пары, злучаныя сакрамэнтам сужэнства, пакліканы наследаваць Хрыста. Ісці за Ім шляхам любові, шчасця і святасці. Equipes Notre-Dame, як дар Духа Святога, дадзены сужэнствам усяго свету як дапамога ва ўзрастанні і перажыванні іх сужэнскай духоўнасці».

Даведнік END

**1. Уводзіны**

Гэта апошняя сустрэча, дзе з дапамогай пілатуючай пары вы знаёміцеся з Рухам Equipes Notre-Dame. Прыйшоў час паразважаць над тым, што вы даведаліся аб Руху. Ці гэтых ведаў для вас дастаткова? Ці ў вашым сэрцы ёсць пытанні, на якія вы шукаеце адказы? Зараз найлепшы час, каб задаць іх пілатуючай пары. Магчыма, веды для вас не з'яўляюцца найважнейшай часткай і вашаму сэрцу бліжэй канкрэтныя прапановы Руху, якія прыносяць змены ў ваша жыццё. Штодзённае сужэнскае і сямейнае жыццё, рэлігійнае жыццё заклікае нас да ўзаемадапамогі ў супольнасці. Падумайце, ці сустрэчы суполкі, ўдзел у пілатажы дапамаглі вам сустрэць Хрыста, пайсці за Ім.

**2. Сустрэча суполкі**

## *І ЧАСТКА СУСТРЭЧЫ*

***Супольны пасілак і дзяленне жыццём***




Накрыты стол падкрэслівае важную падзею ў нашым жыцці. Гэта час стварэння супольнасці. Суполка сустракаецца пры стале, як сям'я. Гэта час радасці і выражэння зычлівасці. Мы сустракаемся ў імя Хрыста. Ён прысутны падчас нашай сустрэчы. Таму спажыванне ежы ў нашай малой хрысціянскай супольнасці, на якім мы збіраемся разам, павінна мець такое самае значэнне, як і спажыванне ежы Езуса з вучнямі, калі Ён збіраў іх пры стале. Духоўнае вымярэнне спажывання ежы ў суполцы павінна перажывацца з падобнай прастатой і ў еднасці.

## *ІІ ЧАСТКА СУСТРЭЧЫ*

***Малітва супольнасці***




**Эф 5, 8 - 21**

Калісьці вы былі цемрай, а цяпер вы святло ў Пану. Паступайце, як дзеці святла. Бо плод святла ёсць ва ўсялякай дабрыні, справядлівасці і праўдзе. Імкніцеся да таго, што даспадобы Пану. Не бярыце ўдзел у бясплённых справах цемры, а лепш выкрывайце іх. Бо пра тое, што яны робяць патаемна, нават сорамна казаць. А ўсё, што выкрываецца праз святло, становіцца яўным, бо ўсё, што становіцца яўным, ёсць святло. Таму сказана: «Прачніся, які спіш, і ўваскрэсні, і Хрыстус асветліць цябе».

Глядзіце дакладна, як паступаеце, не як неразумныя, а як мудрыя. Выкарыстоўвайце час, бо дні ліхія. Не будзьце ж неразважнымі, але пазнавайце, што ёсць воляй Пана. І не

ўпівайцеся віном, ад якога бывае распуста, але напаўняйцеся Духам, настаўляючы саміх сябе псальмамі, гімнамі і духоўнымі песнямі, спяваючы і праслаўляючы Пана ў вашых сэрцах. Дзякуйце заўсёды за ўсё Богу і Айцу ў імя Пана нашага Езуса Хрыста.

Падпарадкоўвайцеся адзін аднаму ў боязі Хрыстовай.

## *III ЧАСТКА СУСТРЭЧЫ*

### ***Духоўнае жыццё. Паглыбленне веры і любові***

*Дзяленне рэалізацыяй канкрэтных пунктаў высілку*

Некалькі словаў аб Канкрэтных Пунктах Высілку:

- **Канкрэтныя:**
  - заснаваныя на перакананні, што прынятыя дзеянні прынясуць карысць;
  - яны адчувальныя; іх трэба выконваць рэгулярна, некаторыя – кожны дзень.
- **Пункты:**
  - вызначаюць дарогу, па якой мы перамяшчаемся павольна, ад пункта да пункта; мы рухаемся сістэматычна, прымяняючы стратэгію малых крокаў, мы заўсёды ў дарозе, мэта ўвесь час перад намі.
- **Высілкі:**
  - дасягненне мэты патрабуе ад нас высілку як духоўнага, так і фізічнага; патрабуе настолькі арганізаванага жыцця, каб мы маглі падпарадкавацца пэўным патрабаванням. Мы самі выражаем згоду на прыняцце высілку.

Вы ўжо ведаеце ўсе канкрэтныя пункты высілку, усе прапановы Руху END. Рух прапануе, каб вы прымалі высілкі не таму, што такая яго ідэалогія, ці кошт, які належыць заплаціць, каб быць удзельнікам Руху. Ён прапануе гэта таму што шмат сужэнстваў ужо пераканалася, якія добрыя вынікі прыносіць рэгулярнае выкананне гэтых высілкаў. Са шчырым сэрцам падзяліцеся тым, што Бог зрабіў у вашым жыцці праз выкананне пунктаў высілку.

- **Прапанаваныя пытанні да дзялення канкрэтнымі пунктамі высілку:**
  - Ці прыкладалі вы намаганні падчас пілатажу, каб узрастаць духоўна?
  - Які канкрэтны пункт высілку для мяне асабіста і для нашага сужэнства з'яўляецца найбольш плённым?

## *Тэкст да абмену думкамі*

Няма хрысціянскага жыцця без жывой веры. Няма жывой веры без рэфлексіі. На практыцы шмат хрысціянскіх сужэнстваў не прыкладае ніякіх намаганняў для разважанняў і паглыблення ведаў, бо недаацэньваюць іх каштоўнасць, ня маюць часу, духоўнага дарадчыка, энтузіязму. Таму іх вера застаецца абмежаванай і нетрывалай, а веды аб плане Божым і навуцы Касцёла павярхоўнымі і няпоўнымі. Няшмат ведаюць аб узрастанні да еднасці з Богам. У іх туманнае паняцце аб рэаліях сямейнага жыцця: аб сужэнстве, любові, бацькоўстве, выхаванні і г.д. У выніку яны мала актыўныя рэлігійна і абмежавана уплываюць на атачэнне.

Сужэнствы Equipes Notre-Dame хочуць прадухіліць гэта. Таму стараюцца паглыбляць свае рэлігійныя веды, прымаць навуку Хрыста, каб згодна з ёй будаваць усё сваё жыццё. Гэты высілак яны прымаюць супольна (*Карта END*).

Каб жыць, трэба есці рэгулярна; каб быць хрысціянінам, трэба рэгулярна падмацоўваць нашыя стасункі з Богам. Канкрэтныя Пункты Высілку – гэта «інструменты» для фарміравання нашай пазіцыі, якія крок за крокам вядуць нас па дарозе ўсё больш хрысціянскага жыцця. Яны не з'яўляюцца ні самамэтай, ні абавязкам, навязаным звонку.

Канкрэтныя Пункты Высілку з'яўляюцца «практыкай», канкрэтнымі заданнямі, якія, калі іх рэалізоўваць кожны дзень з асабістай і сужэнскай зацікаўленасцю, могуць прывесці на шлях сапраўднай сустрэчы з нашым Госпадам і Збаўцам.

Існуе шэсць канкрэтных пунктаў высілку. Тры з іх служаць таму, каб напаўняць і ўзмацняць нашы адносіны з Богам, наша жыццё ахрышчанай асобы. Яны дапамагаюць нам сапраўды сустракацца з Хрыстом.

- **Рэгулярнае чытанне Божага Слова.**
- **Штодзённае прызначэнне часу на «сустрэчу з Госпадам тварам у твар» (асабістая малітва).**
- **Штогадовы ўдзел у рэкалекцыях (мінімум 48-гадзінных і, калі гэта магчыма, з сужэнцам), каб стаць тварам у твар перад Госпадам.**

Дзякуючы гэтым тром пунктам мы будзем трываць у стане слухання Бога. Гэта таксама заклік да бескарыслівасці ў прысвячэнні нашага часу Хрысту, каб Ён змог заняць уласцівае месца ў нашым штодзённым жыцці. Нашыя адносіны з Богам паглыбляюцца таксама тады, калі мы на нейкі час адыходзім ад штодзённасці, каб прыслухацца да Божага плану ў нашым жыцці.

Два наступныя канкрэтныя пункты высілку будуць дапамагаць нам у будаванні нашага сужэнскага хрысціянскага жыцця. Злучаныя сакрамэнтам сужэнства, які з'яўляецца знакам Божай любові для Касцёла, і ласкай для тых, хто яго атрымаў.

- **Штодзённая сустрэча мужа і жонкі на сужэнскай малітве і (калі гэта магчыма) сямейнай.**
- **Штомесячны праўдзівы сужэнскі дыялог ў прысутнасці Госпада (абавязак «Сядзем разам»).**

Сужэнская малітва запрашае нас на штодзённае спатканне – як мужа і жонкі – і на супольную малітву да Бога. Абавязак «Сядзем разам» з'яўляецца штомесячнай сустрэчай, праўдзівым дыялогам удваіх перад Божым тварам, які не варта прапускаць.

Шосты пункт гэта:

- **Вызначэнне «Правіла жыцця» і штомесячны яго перагляд.**

Правіла жыцця выражае наша жаданне быць бліжэй да Хрыста кожную хвіліну нашага жыцця. Гэта адказ на заклік Хрыста: «Будзьце дасканалымі, як дасканалы Айцец ваш Нябесны».

- ***Абмен думкамі на сустрэчы*** 

Аб чым вы будзеце размаўляць у гэтай частцы сусрэчы залежыць ад пытанняў, якія вы скіравалі да пілатуючай пары пасля прачытання Карты END. Дасыланне пытанняў з'яўляецца праяўленнем сапраўднай зацікаўленасці ўдзелу ў пілатажы.

### *Харызмат Руху і педагогіка*

### Педагогіка Руху

Рух узнік, дзякуючы жыццёваму і рэлігійнаму вопыту сужэнстваў, якія хацелі жыць сакрамэнтам хросту і ў святле Евангелля. З кожным разам яны ўсё больш пачыналі разумець патрабаванні хрысціянскага жыцця. Каб знайсці адказы, яны спрабавалі рэалізаваць некалькі практык, якія патрабавалі высілкаў з іх боку. Яны здаваліся ім ключавымі ва ўмацаванні іх з’яднання з Хрыстом. Сужэнцы таксама стараліся сказаць «так» Хрысту і яго выклікам. Можна сказаць, што гэта больш сучасны і адначасова больш супольны метад прыняцця пастановаў!

Сужэнствы, якія носяць у сабе вялікае прагненне ісці – разам з Хрыстом – да Айца, далучаюцца да суполак END. Рух мае заданне падтрымліваць іх на гэтай дарозе. Рух з’яўляецца духоўным выхавацелем сваіх удзельнікаў. Усё, што прапануе Рух, складае гэтае выхаванне: Карта, канкрэтныя пункты высілку, арганізацыя, жыццё суполкі, штомесячныя сустрэчы, але таксама тэмы года, рэкалекцыі, пілігрымкі…

Тут варта падкрэсліць важную ролю Пілатуючай Пары, якая прысутнічае на першых сустрэчах новай суполкі, а таксама Сувязной Пары. Іх роля заключаецца ў тым, каб браць пад увагу асаблівыя сітуацыі/выпадкі, а таксама ў абароне суполкі ад залішняй фантазіі, ці прымянення занадта суровай дысцыпліны без добрага досведу.

Узаемная братэрская дапамога, ад пачатку, лічылася асноўным чыннікам нашай педагогікі.

Ад пачатку ўдзельнікі суполак імкнуліся да поспеху ў сферы любові і жыцця такой таямніцай, якую называюць «ecclesia». Яна з’яўляецца малой хрысціянскай супольнасцю, у якой нараджаецца і абнаўляецца таямніца вялікага Касцёла. Удзельнікі суполак шанавалі таксама духоўную дапамогу, у сапраўднай любові, ва ўсіх сферах: паміж сужэнцамі, сужэнствамі, суполкамі.

Толькі ўдзельнікі радасных суполак, дынамічных у веры, гасцінных, а таксама радасных Божых дзяцей могуць супрацьстаяць выклікам сучаснага свету (як сведкі Божай свабоды і маладосці ў Пану).

*Lettre des Équipes – Moyens et pédagogie*
*(Ліст END – Сродкі педагогікі)*

### 3. Заданні на час паміж сустрэчамі

- **Памятайце аб штодзённай малітве** *Магніфікат.*
- Памятайце аб рэалізацыі ўведзеных канкрэтных пунктаў высілку.
- Памятайце аб супольнай падрыхтоўцы да дзялення жыццём.

Наступная сустрэча будзе апошняй сустрэчай пілатажу і будзе мець крыху іншы ход. Гэта будзе сустрэча падвядзення вынікаў – падсумавання, падчас якога кожнае сужэнства будзе мець магчымасць азірнуцца назад і паглядзець на цэлы год працы. Мы просім, каб да гэтай сустрэчы вы, як звычайна, падрыхтаваліся разам. Можаце для гэтага выкарыстаць сужэнскі дыялог у Божай прысутнасці. Мы прапануем, каб вы задалі сабе наступныя пытанні:

- Як мы ацэньваем Рух пасля пілатажу, ці адпавядае ён нашым чаканням? Незалежна ад таго пазітыўны ці негатыўны наш адказ, абгрунтуем наша меркаванне.
- Як мы адносімся да таго, што нам было прадстаўлена: педагогіка, ход сустрэчаў, пункты высілку?
- Што мы думаем аб супольным жыцці нашай суполкі – падчас сустрэчаў і па-за сустрэчамі?
- Ці ўдзел у пілатажы наблізіў нас адзін да аднаго і да Бога?
- Ці можам мы сказаць, што ідзём, каб сустрэць Хрыста?
- Чаго нам не хапіла падчас пілатажу?

Кожнае сужэнства павінна таксама прыйсці на сустрэчу з рашэннем, ці будзе ўступаць у Рух. Гэтае рашэнне з’яўляецца важным не толькі для кожнага сужэнства, але таксама і для іншых сужэнстваў суполкі. Вы пасябравалі, вы важныя адзін для аднаго.

## Дадатак – тлумачэнне некалькіх паняццяў

***Кодэкс кананічнага права*** – гэта супольная назва касцельных праўных актаў кананічнага права Каталіцкага Касцёла. Слова «права» належыць разумець таксама, як у выпадку свецкага закону, які ёсць абавязковым у канкрэтнай краіне.

***Дэкрэты*** – гэта пісьмовыя ці вусныя выказванні касцельнай улады, адміністратыўнай ці судовай. У адносінах да Руху END дэкрэт *Pontificium Consilium pro Laicis* ці Папскай Рады па Справам Свецкіх, прызнае Рух Equipes Notre-Dame міжнародным аб’яднаннем асобных вернікаў, якое мае статус юрыдычнай асобы. Папская Рада па Справам Свецкіх – гэта Рада, пакліканая папам Паўлам VI. Рада займаецца аб’яднаннямі і апостальствам свецкіх асобаў у Каталіцкім Касцёле.

***Апостальская Канстытуцыя Pastor bonus*** – гэта дакумент абвешчаны Янам Паўлам II, які рэфармуе Рымскую Курыю і асобныя дыкастэрыі.

***Міжнароднае аб’яднанне асобных вернікаў*** – гэта аб’яднанне, заснаванае канкрэтнай касцельнай уладай (у выпадку END Папскай Радай па Справам Свецкіх).